**ВОДГУК**

**навуковага кіраўніка аб дысертацыі Наталлі Уладзіміраўны Мурашкі «Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацы», прадстаўленую на саісканне навуковай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі)**

Дысертацыя Н.У. Мурашкі з'яўляецца цэласным, самастойным завершаным даследваннем, навукова абгрунтаваныя вынікі якога адлюстроўваюць сучасны падыход да рэалізацыі адукацыйных праграм на ўзроўні І ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Навуковая навізна і значнасць атрыманых у даследванні вынікаў вызначаецца:

тэрміналагічным аналізам і ўдакладненнем сутнасці і структуры маўленчага адукацыйнага асяроддзя ў кантэксце сучасных псіхолага-педагагічных і лінгвадыдактычных ведаў;

абгрунтаваннем патэнцыялу фальклорных твораў для мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

вызначэннем тэарэтычных асноў і распрацоўкай структурна-функцыянальнай мадэлі стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору;

распрацоўкай модульнай методыкі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў праз вывучэнне фальклорных твораў як механізма функцыянавання маўленчага адукацыйнага асяроддзя і яе метадычнае забеспячэнне;

стварэннем рэсурсна-метадычнага забеспячэння фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў праз вывучэнне фальклорных твораў.

Даследаванне Н. У. Мурашкі адпавядае сучасным тэндэнцыям навучання, выхавання і развіцця вучняў на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Стварэнне беларускамоўнага адукацыйнага асяроддзя, якое дазваляе фарміраваць у вучняў 1 – 4 класаў навыкі маўлечай і камунікатыўнай дзейнасці праз далучэнне да культурнай спадчыны беларускага народа, з'яўляецца актуальнай праблемай у сучаснай педагагічнай практыцы.

У рабоце дакладна сфармуляваны навуковы апарат даследвання, вызначана яго метадалагічная аснова. Навуковая навізна і практычная значнасць вынікаў даследвання атрымалі сваё адлюстраванне ў абгрунтаваных і дакладных выніках па асобных главах і рабоце ў цэлым. Асноўныя палажэнні дысертацыі знайшлі адлюстраванне ў публікацыях аўтара, які яносяць як навуковы, так і практычны характар. Н. У. Мурашка з'яўляецца аўтарам 21 публікацыі па тэме даследвання.

Матэрыял у дысертацыі пададзены лагічна і доказна, што сведчыць пра тэарэтычную і практычную прапрацоўку аўтарам праблемы даследвання.

Даставернасць і абгрунтаавнасць вынікаў даследвання абумоўлены ўзаемазвязаным і комплексным выкарыстаннем метадаў даследвання, якія прымяняюцца ў адпаведнасці з яго мэтамі і задачамі: колькаснай апрацоўкай эксперыментальных дадзеных і іх якасным аналізам; станоўчым вопытам выкарыстання вынікаў даследвання ў практыцы работы настаўнікаў пачатковых класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання.

Прадстаўленая работа характарызуецца практыка-арыентаванай накіраванасцю. Атрыманыя вынікі і рэкамедацыі могуць паслужыць асновай пры распрацоўцы канцэптуальных палажэнняў методыкі выкладання вучэбных прадметаў «Беларуская мова», «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» і ў межах факультатыўных заняткаў ці аб'яднанняў па інтарэсах; быць выкарыстаны для падрыхтоўкі педагагічных кадраў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах па спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя» і для павышэння кваліфікацыі настаўнікаў пачатковых класаў, выкладчыкаў педагагічных ВНУ.

Саіскальнік Н.У. Мурашка характарызуецца высокім узроўнем прафесіяналізму і адказнасці, актыўнасцю ў навуковай дзейнасці (удзельнік 5 навуковых міжнародных конкурсаў, уладальнік 4-х дыпломаў I – III ступеняў), самастойнасцю меркаванняў і патрабавальнасцю да сябе.

Дысертацыйнае даследаванне Н.У. Мурашка можа быць рэкамендавана да абароны. Вучоная ступень кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі) можа быць прысуджана Н.У. Мурашка за наступныя навуковыя вынікі:

– удакладненне сутнасных характарыстык маўленчага адукацыйнага асяроддзя з пазіцый псіхолага-педагагічных і лінгвадыдактычных ведаў і вызначэнне яго структуры;

– абгрунтванне патэнцыялу фальклорных твораў для мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя праз сукупнасць яго педагагічных магчымасцей у развіцці ўсіх відаў маўленчай і камунікатыўнай дзейнасці вучняў;

– распрацоўку структурна-функцыянальнай мадэлі стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на аснове яго кампанентаў і вызначэнне ўмоў яе рэалізацыі;

– распрацоўку модульнай методыкі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў праз вывучэнне фальклорных твораў як механізма функцыянавання маўленчага адукацыйнага асяроддзя, якая забяспечвае рэалізацыю тэарэтычнай мадэлі на практыцы, яе метадычнага забеспячэння (праект праграмы факультатыўных заняткаў «Фальклорная скарбонка» для I–IV класаў; метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў; метадычныя распрацоўкі да ўрокаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура

(літаратурнае чытанне)» і факультатыўных заняткаў (аб’яднання па інтарэсах); аўтарскі сайт «Фальклорная скарбонка» (folkskarbonka.by)) і дыдактычнага інструментарыя, які забяспечвае прадуктыўны і творчы характар вучэбнай дзейнасці навучэнцаў.

Навуковы кіраўнік
начальнік Цэнтра арганізацыйна-метадычнага забеспячэння адукацыйнай дзейнасці БДПУ,
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт І.А.Турчанка

Подпіс
сведчу: начальнік АК БДПУ
15.08.2025